кодаў і рэгіянальных брэндаў, трансляцыі іх у сусветную культуру, уплывае на асэнсаванне і засваенне чалавекам рэгіянальнай культурнай спадчыны. У перспектыве бібліятэкі, дзякуючы выкарыстанню бібліяграфічных метадаў і інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, могуць выступіць цэнтрамі інтэграцыйных працэсаў з іншымі сацыяльнымі інстытутамі па генерыраванню новых формаў краязнаўчых рэсурсаў.

Павысіўся ўклад беларускіх даследчыкаў у распрацоўку тэарэтычных, гістарычных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства (І. У. Градоўкіна, А. І. Касінская, Т. В. Кузьмініч, А. В. Прадзеіна, С. А. Пугачова, В. І. Саітава, І. М. Стрыжонак і інш.).


*1.* IFLA Strategy 2019–2024 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vimeo.com/355912200. – Дата доступу: 30.08.2019.

*2.* Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by. – Дата доступу: 30.08.2019.

*3. Ханенко, В. И.* Развитие рекомендательной библиографии в БССР / В. И. Ханенко // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. – Минск, 1976. – С. 56–75.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАЛІНАВЫ ЗВОН СПАДЧЫНЫ: ДЗЕЙНАСЦЬ ЭТНАГРАФІЧНАГА ГУРТКА


***Т. А. Сандалава,***

*магістр педагагічных навук*

*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*



У артыкуле пададзены своеасаблівы справаздачны матэрыял этнаграфічнага гуртка «Спадчына» пры музеі «Беларуская хатка».

Дзейнасць этнаграфічнага гуртка непасрэдным чынам накіравана на захаванне культурнай спадчыны. Заняткі праводзяцца згодна са складзеным планам работы гуртка ў адпаведнасці з праграмай. Рэалізацыя акрэсленых мэты і задач праграмы гуртка садзейнічае выхаванню і развіццю цікавасці да сваіх вытокаў, глыбокай павагі да нацыянальнай спадчыны беларускага народа. Змест праграмы раскрывае асноўныя пытанні духоўнай сутнасці народнай культуры. Дзейнасць этнаграфічнага гуртка вельмі спрыяльная пры музеі. Гэта дае дадатковыя магчымасці для даследавання разнастайных аспектаў спадчыны, дзе мінулае і сучаснае так цесна пераплятаюцца, што проста немагчыма ўявіць адно без другога.

Беларускі народ пакінуў нашчадкам багатую матэрыяльную і духоўную спадчыну. З каштоўнай нацыянальнай спадчынай сваёй Радзімы знаёміцца кожны культурны чалавек, бо веданне сваіх вытокаў, сваіх каранёў садзейнічае фарміраванню пачуцця нацыянальнай годнасці, любові да свайго народа, краіны, дзяржавы, выхаванню нацыянальнай свядомасці.

Работа гуртка пастроена на прынцыпе комплекснага падыходу да вывучэння народнай культуры, што абумоўлена непадзельнасцю яе духоўных і матэрыяльных асноў.

Гурткоўцы знаёмяцца і паглыбляюць веды пра жыццё беларускага сялянства ў мінулым, пашыраюць уяўленне пра побыт, традыцыі, звычаі, рамёствы, што існавалі на Беларусі ў канцы XIX – першай палове XX ст. Праз пошукавую краязнаўчую работу прывіваецца цікавасць да культурнай і духоўнай спадчыны свайго народа.

Блізкае, роднае заўсёды можна быць побач разам з памяццю пра тых, каго ўжо няма. І рэчы, перададзеныя навучэнцамі і выкладчыкамі ў музей, сведчаць аб тым, што нашы продкі з намі ў нашых успамінах і асэнсаваннях іх штодзённых клопатаў. Папаўненне экспанатамі музея і іх вывучэнне –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта не толькі паглыбленне ў свет мінулага, гісторыю, але шанаванне продкаў, памяць пра нашы карані.

Вывучаючы побыт беларускага селяніна, мы цвёрда ведаем адно: не бывае дробязных, непатрэбных ці малазначных рэчаў і прылад. У беларуса да ўсяго сваё належнае месца і адпаведная роля. Прычым многія рэчы мелі не толькі ўтылітарныя, але і магічныя ўласцівасці. Падчас даследаванняў можна пераканацца, што вёскі і дагэтуль застаюцца невычэрпнай крыніцай фальклору, этнаграфіі, народных промыслаў. У сельскага чалавека ёсць свая нацыянальная культура – лад жыцця, звычаі, побыт. Разам з прадметамі хатняга ўжытку, прыладамі працы, элементамі касцюмаў вывучаецца і духоўная культура – легенды і паданні розных рэгіёнаў Беларусі.

Гурткоўцы ствараюць справаздачы і прэзентацыі па традыцыях вясковага побыту продкаў, мясцінах дзяцінства (найбольш адметныя даследчая праца «Задуменна вераснёвы Крошын…» і відэафільм «Задуменна вераснёвы Крошын» (у форме віртуальнага падарожжа), дзе прадстаўлены і апісаны асноўныя выдатнасці мястэчка, звязаныя з яго сучаснасцю і мінулым). Даследаванне вёсак Беларусі – гэта яшчэ адна крыніца гісторыі нашага краю і памяць.

Даследуючы паходжанне свайго роду, сваёй сям'і, матэрыялы пра вёску, яе былых уладальнікаў, вылучаючы асаблівасці, звычаі і традыцыі, гісторыю і самабытнасць культурнага асяроддзя сваёй мясцовасці, далучаешся да вывучэння гісторыі, этнаграфіі і творчай спадчыны і іншых рэгіёнаў, прычым не толькі Беларусі. Гурткоўцамі ў рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» былі створаны даследчыя работы: «Браму скарбаў роднай зямлі адчыняю…» да конкурсу «Таямніцы малой радзімы»; «Казала качарга гуляць да чацвярга» да конкурсу юных экскурсаводаў музеяў (музейных пакояў) у намінацыі «Гісторыя аднаго экспаната»; «А радавод мой не гэтакі ўжо і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сукаваты..» і інш. Для папулярызацыі беларускай мовы створана даследчая работа пра прафесію тынкоўшчыка-маляра «Не бывае нязначных прафесій…» да конкурсу «Праз творчасць у прафесію жыцця» ў намінацыі «Мой шлях да прафесіі жыцця».

Гуртkоўцы ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах («Угодкі з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа», сустрэчы пошукавых атрадаў), наведваюць спектаклі («Сымон-музыка», «Адвечная песня» і інш.) і музеі (экскурсійна-пазнавальны праект «Музейныя лабірынты» і завочныя экскурсіі ў Музейны комплекс старажытных народных промыслаў і тэхналогій «Дудуткі», у Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры ў Строчыцах і інш.).

Праца гуртка немагчыма без узнаўлення і захавання беларускіх народных традыцый. Намаганнямі гуртkоўцаў створана электронная база матэрыялаў па беларускім фальклоры і этнаграфіі (лекцыі, сцэнарыі, прэзентацыі, беларуская музыка). Падрыхтаваны сцэнарыі і праводзяцца мерапрыемствы, звязаныя з беларускім фальклорам («Заручыны», «Каляды», «Калядная варажба», «Масленіца», «Траецкія гулянні», «Купальскі карагод» і інш.).

Такім чынам, захаванне культурнай спадчыны ў межах этнаграфічнага гуртка адбываецца непасрэдна і апасродкавана праз усю разнастайную дзейнасць навучэнцаў: пры знаёмстве з фальклорным і этнаграфічным матэрыялам на саміх занятках гуртка і пры выкананні пошукавых творчых заданняў па вывучэнню сваёй мясцовасці, свайго роду, сваёй сям'і; пры ўдзеле ў мерапрыемствах, конкурсах, акцыях, што праводзяцца ў навучальнай установе, аддзеламі адукацыі і краязнаўства, і стварэнні ўласнага радаводу, прэзентацыі сваёй вёскі, сваёй малой радзімы.

У наш час існуюць самыя разнастайныя формы і прыёмы гуртковай работы, як традыцыйныя, так і новыя, якія ўзніклі ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага развіцця грамад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства і інтэрнэт-рэсурсаў. Ад працы ў музеях і гуртках пэўных установў, ад выдання зборнікаў і стварэння сайтаў да фэстаў экскурсаводаў і стварэння інтэрнэт-парталаў (Некропалі Беларусі). Што толькі не з'яўляецца аб'ектам і прадметам даследаванняў спадчыны: запісы-ўспаміны, мясцовыя іконы, геральдычныя знакі, забытыя і невядомыя магілы і імёны, руіны крэпасці і інш.

Далучэнне да дзейнасці этнаграфічнага гуртка замежных студэнтаў – гэта яшчэ адзін з накірункаў працы. Важны ён як для беларускіх, так і для замежных навучэнцаў. Гэта своеасаблівая перадача і захаванне культурнай спадчыны славянскіх народаў і лінгвакультуралагічны аспект пры вывучэнні рускай мовы як замежнай. Пры сумеснай дзейнасці большая цікавасць выяўляецца і ў беларускіх навучэнцаў. Яны глыбей пачынаюць усведамляць вартасць народных традыцый. Замежныя навучэнцы далучаюцца да лінгвакраязнаўчага аспекту Беларусі (мерапрыемствы «Калядная варажба», «Этнасвята», «Масленіца»).

Праца па папулярызацыі і захаванню культурнай спадчыны, безумоўна, мае свае адметнасці і складанасці, але яна вельмі неабходная і патрэбная ў сучасным грамадстве і для выхавання маладога пакалення, і для захавання гістарычнай памяці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПОСТАНОВКИ МАЛЫХ ФОРМ В ИСКУССТВЕ ПРЕДСТАВЛЕНИЯ: К ВОПРОСУ О ТЕРМИНОЛОГИИ

***Ю. М. Свердлова,***
*аспирант кафедры белорусской и мировой художественной культуры Белорусского государственного университета культуры и искусств*

В связи с актуализацией постановок малых форм пространственно-временных видов искусств, находящихся на уровне